[7] Там жа. 25 июня.
[8] ЦПА ІМЛ. Ф. 17, воп. 21, спр. 528, л. 314—315; спр. 408, л. 48—50.
[9] Там жа. Спр. 525, л. 122—124.
[10] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 1 а, спр. 59, л. 36—42.
[11] ЦПА ІМЛ. Ф. 17, воп. 22, спр. 262, л. 419; спр. 320, л. 61—62; спр. 351, л. 90—94.
[12] Гл.: Саракавік І. А. Ленинский комсомол Белоруссии в цифрах и фактах. Минск, 1980. С. 18.
[13] XX съезд Всесоюзного Ленинского Коммунистического Союза Молодежи: Документы и материалы. М., 1987. С. 13, 22.

І. В. ЗДАНОВІЧ

## АГІТАЦЫЙНА-ПРАПАГАНДЫСЦКАЯ РАБОТА КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ СЯРОД ПАРТЫЗАН У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Важным напрамкам дзейнасці Беларускага камсамола ў гады Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў была палітыка-масавая і прапагандысцкая работа сярод партызан, якая ажыццяўлялася пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, падпольных партыйных арганізацый.

Палітычная работа праводзілася з улікам канкрэтных умоў розных этапаў барацьбы. Так, у першы перыяд вайны падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі галоўную ўвагу звярталі на тое, каб умацаваць веру партызан і насельніцтва ў непазбежны разгром фашызму, уцягнуць савецкіх людзей у актыўную барацьбу.

Ва ўмовах карэннага пералому і перамаганоснага наступлення Чырвонай Арміі ў цэнтры ідэйна-палітычнай работы партыйнага і камсамольскага падполля аказалася мабілізацыя народных мас на аказанне ўсебаковай дапамогі савецкім войскам для хутчэйшага разгрому ворага і выгнання яго з нашай зямлі. Перад партызанскім рухам Беларусі ў той перыяд паўстала найважнейшая задача — выратаванне насельніцтва ад знішчэння і прымусовага вывазу ў германскае рабства, а таксама захаванне народнай маёмасці ад рабавання акупантамі. Вялікае значэнне ў гэты перыяд набыла дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў па растлумачэнню партызанам і насельніцтву неабходнасці захавання ўраджаю ад захопнікаў.

Састаўной часткай ідэйна-палітычнай работы партыйных і камсамольскіх арганізацый як у пачатку вайны, так і ў наступны перыяд было развенчванне ілжывай фашысцкай прапаганды. Праводзячы вялікую агітацыйную работу ў масах, партыя і камсамол гаварылі народу ўсю праўду, растлумачвалі сапраўдную сутнасць каварных планаў гітлераўскіх захопнікаў. Пры рашэнні гэтых задач выкарыстоўваліся розныя формы і метады палітычнага ўздзеяння: індывідуальныя і калектыўныя гутаркі, лекцыі, даклады, мітынгі, выпуск газет і «баявых лісткоў», праслухоўванне савецкіх радыёперадач, канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Эфектыўнай формай ідэйна-палітычнай работы Ленінскага камсамола Беларусі ў тыле ворага з'яўлялася вусная прапаганда і агітацыя. У 1942 годзе асноўная маса камсамольскіх прапагандыстаў і агітатараў аб'ядноўваецца ў агіткалектывы. У 1943—1944 гадах колькасць агітатараў і прапагандыстаў, агітацыйна-прапагандысцкіх груп значна павялічылася. Так, у Баранавіцкай вобласці ў 1943 годзе агітацыйную работу сярод партызан вялі звыш 100 прапагандысцкіх груп, а ў Мінскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях працавала звыш 5,7 тыс. маладых агітатараў [1].

Аналіз тэматыкі гутарак, лекцый і дакладаў паказвае, што яны ахоплівалі вялікае кола пытанняў: «Айчынная вайна савецкага народа», «Пра бягучы момант», «Вераломнае нападзенне фашысцкай Германіі на СССР», «Ход сучаснай вайны», «Міжнароднае становішча, што склалася ў ходзе сучаснай вайны», «Чаму непазбежны крах гітлераўскай Германіі?» і г. д.

Важным напрамкам ідэйна-палітычнай работы партыі і камсамола з'яўлялася дакладнае прапагандысцкае асвятленне поспехаў Чырвонай Арміі, яе перамог пад Масквой, Сталінградам, на Курскай дузе.

Нямала гутарак прысвячалася гераічнай барацьбе партызан і падпольшчыкаў. Вось некаторыя з іх: «Гісторыя зараджэння і развіцця пар-

тызанскага руху ў Айчыннай вайне», «Хто такія партызаны?», «Партызан Міхаіл Сільніцкі», «Герой Савецкага Саюза Зоя Касмадзям'янская», «Гераізм моладзі ў Вялікай Айчыннай вайне». Камсамольскія агітатары праводзілі лекцыі і гутаркі аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці У. І. Леніна, вядомых дзеячоў Камуністычнай партыі, пра баявыя традыцыі партыі і камсамола, аб гераічным мінулым савецкага народа.

Вусная прапаганда і агітацыя не прыпыняліся нават у час напружаных баёў супраць карнікаў, калі ўмовы для яе правядзення асабліва ўскладняліся. Прыкладам можа служыць агітацыйна-прапагандысцкая работа камсамольскіх арганізацый у перыяд баёў партызанскіх атрадаў і брыгад Суражскай зоны супраць гітлераўцаў у лютым — сакавіку 1943 года. Так, у брыгадзе імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамола агітатарамі былі праведзены гутаркі пра 25-ю гадавіну Чырвонай Арміі і разгром фашысцкіх войск пад Сталінградам, аб рускіх палкаводцах і значэнні партызанскай барацьбы ў Вялікай Айчыннай вайне. Усё гэта, безумоўна, аказвала станоўчы ўплыў на маральны настрой партызан. Нягледзячы на тое, што прыходзілася штодзённа адбіваць па некалькі атак ворага, не спаць па некалькі сутак, у брыгадзе не было выпадкаў невыканання загадаў.

Калектыўныя чытанні газетных і часопісных артыкулаў, твораў мастацкай літаратуры ў той час былі дзейснай формай палітычнага выхавання. Асаблівай папулярнасцю ў юнакоў і дзяўчат карысталася кніга М. Астроўскага «Як гартавалася сталь», якая перадавалася з рук у рукі. Вобраз Паўла Карчагіна ўсяляў у маладых партызан веру ў перамогу, прымушаў мацней біць ворага.

Важная роля ў ідэйна-палітычным выхаванні партызан адводзілася палітзаняткам, палітінфармацыям, на якіх зачытваліся зводкі Савінфармбюро, вяліся гутаркі пра важнейшыя падзеі з жыцця савецкага тылу, пра барацьбу партызан і падпольшчыкаў.

Моцным сродкам выхавання маладых партызан, павышэння іх баявой актыўнасці аказаліся праводзімыя пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый мітынгі і сходы. Яны праводзіліся перад выхадам на баявую аперацыю, пасля ўдалага бою, з прычыны гібелі таварышаў.

Вялікую дапамогу камсамольскім арганізацыям у правядзенні агітацыйнай работы аказвалі работнікі ЦК ЛКСМБ, члены абкомаў і райкомаў камсамола. Сакратары ЦК ЛКСМБ М. В. Зімянін, К. Т. Мазураў, Ф. А. Сурганаў, сакратары падпольных абкомаў ЛКСМБ А. Д. Рудак, В. І. Лузгін, А. К. Рыбакоў, Ф. А. Башкінцаў, І. А. Матыль, С. І. Пармон, Т. М. Стрыжак, П. Е. Папоў, І. Е. Палякоў, Н. М. Лыжын, А. А. Бірукоў, О. С. Далжэнкова, П. М. Машэраў, інструктары ЦК М. А. Карповіч, А. Ю. Дзенісевіч, Б. Д. Селіванаў, М. І. Сіманаў і іншыя кіруючыя камсамольскія работнікі, што знаходзіліся ў тыле ворага, сістэматычна выступалі з дакладамі перад камсамольцамі і моладдзю.

Інструктар ЦК ЛКСМБ К. С. Дзянісава ў лютым — сакавіку 1943 года прачытала даклады «Разгром гітлераўскіх полчышч пад Сталінградам», «Працоўныя савецкага тылу ў Айчыннай вайне» у партызанскіх атрадах №№ 100, 115, 573, 720, 751 Магілёўскай вобласці. У маі — чэрвені 1943 года 38 разоў выступаў з дакладамі перад партызанамі і насельніцтвам член Віцебскага абкома камсамола В. Н. Пазняк. Лектар Гомельскага АК ЛКСМБ К. Л. Ліхачоў за гэты перыяд прачытаў у партызанскіх атрадах 16 дакладаў на тэму «Моладзь у Айчыннай вайне»[2].

Пытанні агітацыйна-прапагандысцкай работы ўвесь час знаходзіліся ў цэнтры ўвагі ЦК ЛКСМБ, падпольных абкомаў, райкомаў камсамола. 5 студзеня 1943 года Віцебскі абком камсамола прыняў пастанову «Аб стане палітычнай работы з несаюзнай моладдзю партызанскіх атрадаў і далучэнне яе перадавой часткі ў камсамол». У пастанове ўказвалася, што «райкомы камсамола, камсамольскія арганізацыі партызанскіх атрадаў мала ўвагі ўдзяляюць палітычнай рабоце з несаюзнай моладдзю. Лекцыі, даклады, гутаркі пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, пра гераізм байцоў Чырвонай Арміі і партызан, аб палкаводцах рускай арміі і іншыя праводзяцца зрэдку. Камсамольскія арганізацыі недастаткова папулярызуюць вопыт работы камсамольцаў і моладзі, якія праявілі сябе ў баях за Радзіму». Бюро АК ЛКСМБ абавязала райкомы камсамола і атрадныя арганізацыі прыняць практычныя меры па паляпшэнню ідэйна-палітычнай работы сярод маладых партызан [3].

Выконваючы ўказанні абкома камсамола, камсамольскія арганізацыі

партызанскіх атрадаў Віцебскай вобласці актывізавалі агітацыйна-прапагандысцкую работу. Толькі ў 1-й Беларускай брыгадзе камсамольцы-агітатары правялі гутаркі «Моцныя людзі», «Партызаны дапамагаюць фронту», «Партызанская барацьба», «Смелы заўсёды перамагае», «Руская душа», «Абарона Сталінграда», «Партызаны-разведчыкі» і іншыя [4].

У снежні 1943 года па рашэнню Вілейскага абкома камсамола ў трох зонах вобласці (паўночнай, цэнтральнай, паўднёва-усходняй) былі праведзены нарады сакратароў РК ЛКСМБ па прапагандзе, на якіх былі выяўлены недахопы ў правядзенні агітацыйнай работы ў партызанскіх атрадах [5]. Пасля гэтых нарад падпольныя райкомы камсамола, камсамольскія арганізацыі партызанскіх атрадаў значна павялічылі колькасць і якасць лекцый, гутарак, дакладаў. За люты 1944 года камсамольскія агітатары вобласці прачыталі і правялі звыш 270 дакладаў і гутарак для партызанскай моладзі, на якіх прысутнічала каля 7 тыс. чалавек [6].

Умела арганізаваная ідэйна-палітычная работа ў атрадах і брыгадах аказвала значны ўплыў на актывізацыю іх баявой дзейнасці, служыла справе згуртавання падраздзяленняў, умацавання ў іх воінскай дысцыпліны, павышэння ідэйнай загартоўкі партызанскай моладзі. 24 лютага 1944 года сакратар Брэсцкага АК ЛКСМБ Ф. Д. Ромма пісаў, што палітыка-масавая работа, якую праводзілі камсамольцы, дала канкрэтныя вынікі: узмацніліся баявыя справы камсамольцаў і моладзі, узрасла іх дысцыпліна, значна выраслі камсамольскія арганізацыі за кошт лепшых маладых партызан. Толькі за 1943 год маладымі партызанамі Брэстчыны, па няпоўных звестках, было знішчана больш за 1400 гітлераўцаў, пушчана пад адхон 412 варожых эшалонаў, разбіта 346 паравозаў і 2980 вагонаў, узарвана 96 аўтамашын, 92 шашэйныя і чыгуначныя масты, знішчана 356 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Камсамольцы ўдзельнічалі ў разгроме 82 гарнізонаў праціўніка [7].

Такім чынам, масавая па характару, мабільная па формах і метадах, глыбока ідэйная па зместу, вусная палітычная прапаганда і агітацыя камсамола, дзякуючы ўдаламу партыйнаму кіраўніцтву, духоўна ўзбройвала моладзь у барацьбе з моцным і каварным ворагам, усяляла ў сэрцы змагароў перакананне ў перамогу, была жыватворнай крыніцай фарміравання высокіх баявых і маральных якасцей партызан.

[1] Ленинский комсомол в Великой Отечественной войне. М., 1975. С. 376.
[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 3856, воп. 1, спр. 15, л. 132; Ф. 63, воп. 16, спр. 8, л. 40.
[3] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 63, воп. 16, спр. 12, л. 163.
[4] Там жа. Ф. 3500, воп. 4, спр. 16, л. 302.
[5] Там жа. Ф. 63, воп. 16, спр. 9, л. 149.
[6] Там жа. Воп. 5, спр. 77, л. 49.
[7] Там жа. Воп. 16, спр. 15, л. 70, 71.

І. Д. СТАДУБ

## РОСТ І ПАЛЯПШЭННЕ САСТАВУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ (ліпень 1944—1961)

Вызваленне тэрыторыі рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў, а затым пераможнае заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны паставілі перад беларускім народам і КПБ як яго авангардам складаныя і адказнейшыя задачы па паскоранаму аднаўленню разбуранай гаспадаркі, жылля. Трэба было неадкладна накіраваць творчую энергію і ініцыятыву мас на вырашэнне гаспадарчых і палітычных задач, колькасна і якасна ўмацаваць партыйныя арганізацыі, павысіць іх уплыў на важнейшых участках прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, у дзяржаўных і грамадскіх арганізацыях, узняць авангардную ролю камуністаў.

У. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў, што сіла партыі ў першую чаргу вызначаецца якасным саставам яе членаў, іх ідэйнасцю, арганізаванасцю і дысцыплінай. Ён пісаў, што наша партыя — «адзіная ўрадавая партыя ў свеце, якая клапоціцца не аб павелічэнні колькасці членаў, а аб павышэнні іх якасці...»[1] На думку У. І. Леніна, ад якаснага саставу партыйных радоў у значнай ступені залежыць характар і змест дзейнасці партыі, усіх яе арганізацый.